Методическая гостиная, которая была показана в рамках конкурсного просмотра, дала возможность ее участникам (специалистам клубных учреждений области) познакомиться с большим разнообразием форм популяризации фольклорного наследия д.Горы. Материал был разработан и представлялся участниками народного фольклорного коллектива «Горские хорошухи» Горского СДК, руководителем которого является Марченко Валентина Александровна. Она же была ведущей и хозяйкой гостиной. Валентина Александровна представляла фольклорную программу «Спяваем песні мы з сялянскіх хат», основанную на местных фольклорных песнях и преданиях. Затем была представлена форма организации работы этнографического уголка – познавательно-игровая программа «Родная хата – працай багата» и многое другое. Мастерство и организаторские способности ведущей, грамотно и содержательно подобранный фольклорный материал – всё это позволило гостям и участникам методической гостиной получить полное представление о фольклорном наследии д. Горы. Интерактивные формы обучения дали возможность участникам освоить методику их проведения, соприкоснуться с материалом









на эмоциональном уровне, прочувствовать неповторимую красоту и духовность фольклорного наследия Краснопольского края.

Финал конкурса состоится в декабре 2015 года на базе Могилевского областного методического центра народного творчества и культурно-просветительной работы. В рамках финальных мероприятий будет проходить областной конкурс «Лучший методист учреждений культуры клубной системы».

Смотр-конкурс поможет не только определить сильные и слабые позиции деятельности методических служб клубных учреждений области, но и даст возможность специалистам методических служб повысить свое профессиональное мастерство посредством подготовки конкурсных заданий и посещения презентации конкурсных заданий других регионов.

По итогам проведения смотра-конкурса жюри смотра-конкурса определит победителей в следующих номинациях:

- «Лучшая методическая служба»
- «За лучшую организацию и проведение методической учебы»
- «Лучший методист учреждения культуры клубной системы»
- «Лучшее информационно-методическое обеспечение клубной системы».

***В.И. СМОТРИКОВА*****,**
***начальник отдела УК***
***«Могилевский областной***
***методический центр НТ и КПР»***

# Сцэнарый інтэрактыўнага фальклорна-этнаграфічнага занятку «Родная хата працай багата»



Ой, гасцей як тут багата!
Ўсіх у хату запрашаю!
І сардэчна вас вітаю:
І дарослых, і дзяцей,
І шаноўных ўсіх гасцей!

О, дзеці, матулі, бабулі!
Хай добра вам будзе,
Хай весела будзе!
Мы будзем не толькі спяваць,
танцаваць –
Народную спадчыну хочам
пазнаць!

Вы хочаце радасць сапраўдную
зведаць,
Дык пойдзем тады ў незвычайны
паход!
Хачу ЭТНАГРАФІІ цуды паведаць,
ФАЛЬКЛОРУ, якім ганарыцца
народ.
У падарожжа з сабою бяру
Вас – цікавую гэту дзятву!
Калі ласка ў беларускую хату!

Вы заходзіце ў святліцу…
Што там бачыце? Бажніцу!
Ручнік на бажніцы набожнікам
звалі,
І покуць у хаце ім аздаблялі.
Гэты ручнік – ўцірач,
А гэты ручнік – трапкач.

Гэта пралка.
Ля вакна, нібы чмель, гудзіць яна.
Многа людзі працавалі:
сеялі, палолі, рвалі,
Як вялося здавён,
шаўкавісты доўгі лён.

*(Гучыць песня "Пасеялі дзеўкі лён")*

Пасеялі дзеўкі лён. – 2 р.
Ай, люлі, дзеўкі лён. – 2 р.

*(У кожным куплеце такія паўторы)*







Пабралі дзеўкі лён.
Белы бужаль папралі.
Сатквалі ручнікі.
Ручнікоў наткуць і на рэчку
нясуць.
У ваду спярша намочаць,
Потым пральнікам калоцяць.
*(Ідзе паказ-імітацыя)*
А навошта? Хто адкажа?
Так ручнік бялеў адразу!

Ручнікоў у хаце – гляньце:
На бажніцы і на рамцы,
На цвіку каля вакна…
Вышывалі іх спаўна!

Як дзяўчына на выданні –
Вышывалі аж да рання!
Адарыць радню мілога –
Ручнікоў мець трэба многа.

Шчэ дарылі паясы
Непаўторнае красы.
Кожная з дзяўчын чакала,
Каб ёй вёска заспявала…

*(Выконваецца вясельная песня, абыгрываецца пад змест песні зняцце фаты, накладванне наміткі. Або выконваецца іншая вясельная песня)*

**Вясельная песня**

Пасярод стала свяча гарэла,
Там наша Насцечка дары рэзала.
Дары рэзала, шчэ й гаварыла:
Ой, дары мае недабеленыя.
Касіца мая недарошчаная.
Бяліцесь, дары пад расіцаю.
Расці, касанька, маладзіцаю.
Маладзіцаю, шчэ й малодкаю.
Шчэ й малодкаю – пад намёткаю.

Па ўзору ручнікоў і па гаме: па
чырвонай,
Ці па чорнай, надварот,

Можна вызначыць падзеі
Кожнай хаты – на ўвесь год!
Бачым крыж у кветках – Пасха,
Кветка-папараць – Купалле.
Як вяселле – чырвань ззяе,
Пост, - ён сціпласць ўзору мае.

Меў ручнік наш Краснапольскі
Ромбы, крыжыкі і зоркі, -
Бо, як ткалі ручнікі,
Тут канон ўжо быў такі!

Што ні знак – то сімвал нейкі:
Ці ўраджаю, ці зямелькі,
Сімвал разнастайных святаў –
Іх ў жыцці было багата!

Умеў народ наш працаваць
Умеў і святы ён спраўляць!
І Ражство, й Калядкі, Пасху,
Тройцу, Сёмуху, Пакровы…
На вяселле – калі ласка!
Хрэсьбіны – частунак новы!

Пакуль святочных дзён чакалі,
уборы-строі рыхтавалі.
Як сапраўдны мастак,
шыла бабка андарак.
Фартух, кашулю вышывала,
Кветачкамі аздабляла.
Не адну сядзела ночку
За мужчынскаю сарочкай.

Дзед у залатым капелюшы
Умела плёў лазовыя кашы.
А дзе яны былі патрэбны?

*(Прапануецца конкурс. Два ўдзельнікі спрабуюць закінуць бульбу ў кошык.)*

Пад бульбу пойдуць кошыкі,
пад зёлкі,
Маленькі кош – камусьці дар
пад ёлку.
Усё ўмеў дзед. Без лішніх слоў
Лыка драў і лапці плёў.
Ён сябе, сыноў і ўнукаў
Абуваў такой навукай.

Пражу пралі, кросны ткалі –
Выйшлі посцілкі на славу:
Хоць на ложак, хоць на лаву.







Здзівіць, нават незнарок,
І вось гэты дыванок:
Яркі, рознакаляровы,
І праз сто гадоў – як новы!

Вабіць ходнік паласаты –
Даўні ўбор вясковай хаты.
На ходнічак аж боязна ступіць:
Вясёлкаю нябесная зіхаціць.

Трэба ведаць – сэрца просіць,
Як дзядам, бацькам жылося.
Як сахой раней аралі,
Як смыком зямлю бярлялі.
Трэба ведаць і пра тое,
апраналі што, якое.
Трэба ведаць і пра тое, што
спявалі, ў што гулялі…

Запрашаю ўсіх на гульні, каб
павесяліцца.
Тут і спрыт ваш, і снароўка вельмі
прыгадзіцца!

Зараз гульня "Ішла вулачкай".
Для яе патрэбны хлопчыкі,
выходзьце, хто жадае. А з дзяўчат
гуляе тая, хто хустачку атрымае.
*(Хлопцы становяцца ў радок так, каб паміж імі можна было прайсці. Дзяўчына з хустачкай-насовачкай павінна танчыць паміж імі пад песню "Ішла вулачкай".)* Я
пачну, вы назірайце і са мною
падпявайце.

Ішла вулачкай, перавулачкам.
Перавулачкам йшла, клубок нітак
знайшла.
Клубок каціцца, нітка цягнецца.
Нітачка парвалась – пацалуя
даждалась.

*(Праводзіцца гульня.)*

А зараз прапаную гульню "Лапці".
Вакол лапцей мы танчыць будзем,
Музыку слухаць не забудзем.
А як музыка спыняецца,
Кожны ў лапці "абуваецца".
Хто "абуць" не паспявае,
То з гульні той выбывае,
Да гледачоў ён далучаецца
І разам з намі забаўляецца.

*(Праводзіцца гульня "Лапці".)*

Так гулялі мы, дзіцяткі,
Разбудзілі немаўлятку.
Будзем раз калыхаць,
Калыханачку спяваць.

*(Калыханка "Сіўка-варонка")*

Куды паляцела, сіўка-варонка,
гой-гой, далігойда.
На Іванаў двор, сіўка-варонка, гой-
гой, далігойда.
Што Іван дзелае, сіўка-варонка,
гой-гой, далігойда.
Косы клепе, сіўка-варонка, гой-
гой, далігойда.
Нашто яму косы, сіўка-варонка,
гой-гой, далігойда.
Сена касіць, сіўка-варонка, гой-
гой, далігойда.
Кароў карміць, сіўка-варонка, гой-
гой, далігойда.
Нашто іх карміць, сіўка-варонка,
гой-гой, далігойда.
Малако даіць, сіўка-варонка, гой-
гой, далігойда.
Нашто яму малако, сіўка-варонка,
гой-гой, далігойда.
Ваньку карміць, сіўка-варонка,
гой-гой, далігойда.

Цяпер падыдзем да стала.
Абрус сняжысты дабяла!
На тым абрусе –
з гліны жоўты гляк,
Не надзівіцца на яго ніяк!
Як нальеце квасу ў гляк –
Незвычайны будзе смак!
Халодны і празрысты,
Бы з крыніцы самай чыстай.
Малако ў іх налівайце –
Ганчароў успамінайце!

Тут міскі фарбаваныя,
Прыгожа размаляваныя!
Чаму іх так размалявалі?
Каб ад гора аберагалі!

Два словы ёсць у нас:
жыццё і жыта.
Іх час не возьме ў забыццё,
Бо жыта, хлеб – святы набытак,
А хлеб для нас усіх – жыццё!











Не адзін нажаў снапок
востра зублены сярпок.
Жыта жаў, пшаніцу жаў,
пад страхой не сумаваў.

Слухай, серп, галаву не хілі
заўчасне,
Ты як помнік стары варты добрай
песні.
Каб схіляць да сябе, колькі меў ты
сілы,
Прыгажуні цябе на плячах насілі,
Запяюць ад душы – гэтак люба
стане…

*(Гучыць песня "Жыцечка яравое")*

Жыцечка яравое, полюшка
палявое, гу-у-у.
Іду я дарогаю, пушчу голас
дубровай, гу-у-у.
Няхай мамачка чуе, мне вячэру
згатуе, гу-у-у.
На вячэру цяцеру, сцялі мякку
пасцелю, гу-у-у.
А мой татачка родны, па
дарожачках едзе, гу-у-у.
Па дарожачках едзе, а ка мне не
заедзе, гу-у-у.
За варотамі начуе, усё горачка чуе,
гу-у-у.
Жыцечка яравое, полюшка
палявое, гу-у-у…

…Запяюць ад душы – гэтак люба
стане,
Што так, серп, не кажы,
быў ты у пашане.

Пшанічны колас – важкі самы,
Калі заспее ў жніўны час.
Пшанічны колас – шчодры самы,
Частуе белым хлебам нас.

Вусач-ячмень – пшанічны брат,
Што ён скупы, ніхто не скажа,
Ячменны хлеб з яго зярнят,
І крупнік добры нам, і каша.

Але перш чым есці, трэба ж нешта
напячы!
А дзе варылі і пяклі ў вясковай
хаце?
Нам падкажа загадка, слухайце:

Яна галодная - хата халодная,
Яна пад'ела – у хаце пацяплела.
*(Адказ: печ)* Добра!

А вось і печ – ласкавая матуля,
Што кожнага пяшчотаю атуліць,
Сагрэе ўсіх ласкава ля дзвярэй,
Сагрэе і хваробу адбярэ!

Побач з печчу – гаршчкі, чыгункі –
Пузатыя, мурзатыя працаўнікі.
Былі на капанцы,
былі на кружанцы,
Былі на пажары, былі на базары,
Кашу варылі, людзей кармілі,
А сталі старыя, мы іх пазабылі.

Побач – вілы. А вось качарга –
крывая нага,
Золата ў скрыню грабе, як мага.
Ды не сапраўднае золата гэта,
Астыў вугалёк – пачарнела манета.

Хто ляжаў з вас на пячы?
Можаш мне дапамагчы?
Адпраўляй у печ гаршчок –
Няхай грэе круглы бок,
Кашу смачную гатуе –
І усіх-усіх частуе.
*(Жадаючы спрабуе ўпраўляцца з віламі)*
А пакуль - напячэм аладак!
Папляскайце ў ладкі, хто любіць
бліны ды аладкі?!
Паўтарайце за мной.
*(Праводзіцца забаўлянка "Ладачкі-ладкі".)*
Ладачкі-ладкі, мы пячэм аладкі:
Белыя, ячныя, пульхныя, смачныя.
Са смятанкай іх ядзім, хочаш – і
табе дадзім!
Першы блін комам! Пячэм яшчэ!

Ладак смачных мы наеліся!
І даведацца захацелася:
З зерня як муку малолі?
І навошта ў хаце ступа?
Не Яга ж у ёй ляцела!
Знае хто – кажыце смела!
Гэта што? Так, гэта жоран,
Меле зерне на муку…
З якой аладкі і пякуць.
У ступе зерне так таўкуць,











*(паказвае)*
Ад лупіння ачышчаюць,
Потым ў печы кашу вараць.
Працаю усё даецца, працай ўсё
ствараецца.
Хто працуе, той і мае – так народ
наш навучае.
А зараз адгадайце мае загадкі.
Загадка не адгадваецца сама –
Трэба паспрабаваць вастрыню
свайго ума!

Слухайце першую: Маршчаністы
Ціт усю вёску весяліць. Што гэта?
А зараз слухайце другую:
У лесе: стук-стук,
У хаце: ляп-ляп,
У руках: дзынь-дзынь,
Па падлозе: топ-топ!

Правільна, гэта музычныя
інструменты:
Гармонік ды балалайка.
А на нашых беларускіх драўляных
Мы і самі сыграем!

*(Жадаючыя іграюць на драўляных інструментах пад акампанемент, гучыць песня "Кіну кужаль на паліцу")*

Кіну кужаль на паліцу, сама пайду
на вуліцу, - 2 р.
Няхай кужаль валяецца, за мной
хлопцы ганяюцца. – 2 р.

Палюбіла Васіля, ды нядоля мая.
Я думала кучаравы, - ў яго чуба няма.

Была адна валасіна, тую муха
адкусіла.
Я думала кучаравы, - ў яго чуба няма.

На вуліцы скрыпка грае, мяне маці
не пускае.
Не пускае мяне маць на вуліцу
пагуляць.

Я ў сераду радзілася, ой, гора мне
гора.
Не пайду я за старога, барадою
сколе.

А пайду за маладога, што не мае
вусаў,
Ён на мяне кіўне, маргне, а я
засмяюся.











А цяпер, дзеці, перадайце
свае інструменты дарослым,
паслухаем іх.

*(Гучыць песня "Ярыца" або любая іншая.)*

А ў гародзе ярыца. – 2 р.
Сударыня-барыня, ярыца. – 2 р.
А хлопчык – неўдаліца.
Ой, хлопчычак, ты мой пан,
Выпей мёду хоць стакан.
А я вып'ю хоць і два,
Кабы ты была мая.
Сударыня-барыня ты мая.

Малайцы! Добра мы гулялі,
песні спявалі.
А яшчэ адну загадку пакуль не
адгадалі.
А загадка такая: Што фальклор
азначае?

А адгадка – вось яна:
Песні, гульні, калыханкі,
Прымаўкі і забаўлянкі
У народзе прыдумлялі,
Іх нашы продкі зберагалі,
Нам, нашчадкам перадалі.
Народа мудрасць берагуць,
Яе фальклорам і завуць.
Гэту мудрасць ад народа
Шанаваць трэба заўсёды.

Вельмі хочацца, каб кожны з
гонарам мог казаць так:
Што перадаў мне бацька й маці,
Я буду вечна шанаваці,
Бо для мяне усё – святое,
І я удзячны ім за тое!

Бывайце здаровы, у згодзе
жывіце,
А знойдзеце час, зноў сюды
зазірніце.
Да новых сустрэч, сябры!

***В. А. МАРЧАНКА,***
***метадыст***
***Краснапольскага РЦК***

# Чым можа здзівіць малая радзіма або сучасныя падыходы да захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю,стварэнне новых форм трансляцыі іміджавай культуры Краснапольшчыны

## Метадычная гасцёўня

**Мэты і задачы:**

- Садзейнічанне культурнай самаідэнтыфікацыі, фарміраванню і трансляцыі іміджавай культуры Краснапольшчыны;
- Засваенне сучасных форм і метадаў папулярызацыі фальклорна-этнаграфічнай спадчыны роднага краю, яго рамёстваў;
- Абмен вопытам работы па захаванні і папулярызацыі фальклорна-этнаграфічнай, рамесніцкай, гісторыка-культурнай, прыроднай і культавай спадчыны Краснапольшчыны;
- Папулярызацыя інавацыйных метадаў і тэхналогій, перадавога вопыту работы;
- Стымуляванне дзейнасці, матывацыя да пошукаў і развіцця ў культурна-дзейнаснай сферы.

**Праграма метадычнай гасцёўні (100 хвілін):**

1. Уводзіны ў тэму. (5 хвілін)
2. Мэтапалаганне. Азнаямленне з планам работы. (10 хвілін)
3. Дзейнасна-выканальніцкі (аперацыйны) кампанент:
   . Актуалізацыя тэмы. (5 хвілін). Бачанне актуальнасці фарміравання іміджавай культуры. Выступленне дырэктара ДУК “ЦКС Краснапольскага раёна” С. А. Сазонавай
   . “Спяваем песні мы з сялянскіх хат”. (13 хвілін)
   . З вопыту правядзення фальклорных экспедыцый (інтэрв’ю) і майстар-клас па актуалізацыі аўтэнтычнай песні народным фальклорным ансамблем “Горскія харашухі” (мастацкі кіраўнік В. А. Марчанка); выстаўка метадычнай прадукцыі калектыву
   . “Народны касцюм – адно з найвышэйшых дасягненняў народнай культуры”. (5 хвілін)
   . Азнаямленне з асаблівасцямі Краснапольскага строю адзення; знаходкі ў формах прэзентацыі вынікаў творча-пошукавай, праектнай дзейнасці (Члены творчай групы).
   . “Адгалоскі мінуўшчыны”. (7 хвілін).
   . Сустрэча з носьбітам малых форм фальклору (загадкі, жарты) – (Сідараўскі СДК – Юркіна А. П.); сустрэча з майстрам ігры на гармоніку (Ленінскі СДК – Занудзенка М. А.). Актуалізацыя фальклорнай спадчыны.
   . “Традыцый родных не забыць – яны ад прадзедаў і дзедаў”. (10 хвілін). Выстаўка вырабаў Дома рамёстваў; шляхі і магчымасці папулярызацыі і развіцця народных рамёстваў. (Сустрэча-інтэрв’ю з дырэктарам установы Маскальковай В. В.)
   . “Родная хата працай багата”. (15 хвілін).
   . Майстар-клас па правядзенню інтэрактыўнага занятку ў этнаграфічным кутку. (Метадыст Марчанка В. А.)
   . “Тут стравы такія, што нашы дзяды калісьці яшчэ гатавалі”. (10 хвілін). Асаблівасці традыцыйных страў.
   . Аўтэнтычны абрад “Дзесятуха”. (10 хвілін). Відэафільм. Папулярызацыя.
4. “Ігрышчы ў панскай сядзібе”. (3 хвіліны).
5. Ідэі арганізацыі “брэндавага” фэсту.
6. “Выбар аб’ектаў турыстычнага этнамаршруту”. (2 хвіліны).
7. Рэфлексійна-творчае заданне ўдзельнікам гасцёўні.
8. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія гасцёўні“Шэсць капелюшоў”. (10 хвілін).

**Умовы правядзення метадычнай гасцёўні**

Метадычная гасцёўня разлічана на спецыялістаў клубных устаноў, кіраўнікоў фальклорных калектываў, кіраўнікоў гурткоў і аматарскіх аб’яднанняў, зацікаўленых

у пошуку новых форм папулярызацыі традыцыйнай культуры, яе захавання; зацікаўленых у стварэнні культурных брэндаў Краснапольшчыны.

У метадычную гасцёўню запрашаюцца творчыя калектывы і асобы, гатовыя падзяліцца вопытам актуалізацыі народнай творчасці, яны даюць майстар-класы, інтэрв'ю, праводзяць інтэрактыўныя заняткі і інш.

Гасцёўня забяспечана відэа- і слайд- паказам, фонавай музыкай. У ёй афармлены выстаўкі рамёстваў і этнаграфіі, страў беларускай кухні, інш.

Псіхалагічны і працоўны настрой у гасцёўні ва многім будзе залежыць не толькі ад зместу і форм, тэхналогій, але і ад майстэрста вядучых, актыўнасці ўдзельнікаў і гасцей.

Метадычная падтрымка спецыялістаў устаноў культуры – важная ўмова іх прафесійнага росту, а значыць, і эфектыўнай дзейнасці ўстановы культуры. Арганізуючым цэнтрам работы ў дадзеным напрамку з'яўляецца метадычная служба раённага Цэнтра культуры.

У Краснапольскім раёне пытанням росту прафесійнай дзейнасці спецыялістаў клубных устаноў надаецца шмат увагі. Дзейнасць метадычнай службы прадугледжвае не толькі традыцыйныя, але і актыўныя формы работы, якія характарызуюцца высокай інтэнсіўнасцю зносін удзельнікаў, зменай і разнастайнасцю відаў дзейнасці, рашэннем праблемных сітуацый і актуальных задач, мэтанакіраванай рэфлексіяй удзельнікаў сваёй дзейнасці і ўзаемадзеяння.

Увазе зацікаўленых асоб прапануецца распрацоўка метадычнай гасцёўні з такімі прыёмамі, формамі і тэхналогіямі, як: інтэрактыўны занятак, майстар-клас, прэзентацыя, інтэрв'ю, паказ, аналіз, дэманстрацыя, прадстаўленне, рэфлексійна-творчая гульня, гутаркі, сустрэчы з носьбітамі фальклору і інш.

Метадычная гасцёўня арыентуецца на асэнсаванае засваенне і ажыццяўленне сучасных падыходаў да захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю, на стварэнне розных форм трансляцыі становучага іміджу Краснапольшчыны.

**Уводзіны ў тэму. (5 хвілін).**
**Метадыст 1.**



Добры дзень, паважаныя сябры, калегі!

Спадзяюся, што вы добра ўладкаваліся. Калі не, сышлюся на народную мудрасць: добраму чалавеку добра і ў запечку, а ліхаце дрэнна і на куце.

Меў рацыю Уладзімір Караткевіч, калі пісаў: "У падзеях мінулага – нашы карані. А дрэва без карэння не можа ні існаваць, ні тым больш прыносіць плады".

Паважаныя сябры і калегі, сённяшнее мерапрыемства – метадычная гасцёўня "Сучасныя падыходы да захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю, стварэнне новых форм трансляцыі іміджавай культуры Краснапольшчыны" сваёй назвай і тэмай выразна ставіць тыя задачы, якія з'яўляюцца актуальнымі як для ўсёй Рэспублікі Беларусь, так і для нашага раёна.

Прадстаўленне ўдзельнікаў і гасцей.

Наша метадычная гасцёўня сабрала вас, тых, хто зацікаўлены гісторыка-культурнай спадчынай сваёй малой радзімы! Тых, хто адшуквае залатыя крупіны мінулага, памятуючы запавет: святую веру продкаў, свой род, культуру і Айчыну шануй і беражы!

Сярод гасцей нашай метадычнай гасцёўні – спецыялісты клубных устаноў, кіраўнікі фальклорных ансамблей, гурткоў, аматарскіх аб'яднанняў нашага раёна; метадысты метадычных служб раёнаў Магілёўскай вобласці і, канешне, журы абласнога агляду-конкурсу рэгіянальных метадычных служб клубных сістэм Магілёўскай вобласці "Пошук. Творчасць. Поспех", таму што сённяшнее мерапрыемства праводзіцца ў рамках гэтага конкурсу.

Кіраўніком метадычнай вучобы, а дакладней, гаспадыняй гасцёўні буду я, метадыст метадычнага аддзела Краснапольскага Цэнтра

культуры Валянціна Марчанка. Дапамагаць мне будзе мой калега Павел Шэўлякоў і, спадзяюся, усе вы, паважаныя калегі і сябры, – і тыя, каго я прадставіла, і тыя, з кім мы пазнаёмімся далей: наша гасцёўня багата гасцямі!

Гульня-практыкаванне на стварэнне псіхалагічнага настрою і на ўключэнне ў работу. Паклапоцімся аб нашым настроі!

Калі вы ўмееце чуць добрае, незалежна ад таго, што гаворыцца вакол, усміхніцеся суседу.

Калі вы лічыце, што ваш эмацыянальны стан дапамагае зносінам з акружаючымі, пахлопайце ў далоні.

Настроіцца на работу, думаю, нам дапаможа і прасцейшая гульня "Дапоўні склад". Нагадваю: словы складаем на краязнаўчую, патрыятычную тэму, якая і аб'яднала сёння нас.

Праводзіцца гульня "Дапоўні склад". Вядучы кідае мяч і называе склад слова. Той, хто злавіў мяч, дапаўняе склад да слова. Напрыклад, ра- (-дзіма); фальк- (-лор); эт- (-награфія); пат- (-рыёт) і інш.

Дзякуй, прыемна бачыць вашу актыўнасць! Пачынаем нашу сустрэчу.

**Мэтапалаганне. Практыкаванне на прагназіраванне чакаемых вынікаў.** Актывізацыя думкі ўдзельнікаў гасцёўні. (10 хвілін).

**Метадыст 2.**

Даведаемся пра магчымасці нашай метадычнай гасцёўні. План перад вамі на экране і ў кожнага з вас. Пазнаёмімся з ім. *(Прагаворвае план).*



Нам хацелася б даведацца, чаго асабіста вы чакаеце ад сённяшняй сустрэчы. Прашу ў кароткай форме выказаць свае чаканні на сцікерах.

*(Гучыць фонавая музыка, выконваецца заданне, вядучым агучваюцца адказы).*

Мы рады вашай зацікаўленасці і спадзяёмся на плённасць нашай сустрэчы.

**Метадыст 2.** *(На экране мэты і задачы метадычнай вучобы)*

Мяркуем, што ў ходзе сустрэчы мы зможам абмяняцца вопытам і сваімі творчымі знаходкамі; засвоіць на практыцы пэўныя ўменні і пачарпнуць новыя ідэі, а яшчэ – атрымаць натхненне ў стварэнні і брэндавых праяў традыцыйнай культуры, і новых форм засваення народнай спадчыны. Не выпадкова ў сённяшняй гасцёўні ёсць і другая назва – "Чым можа здзівіць малая радзіма".

**Дзейнасна-выканальніцкі кампанент метадычнай гасцёўні.** Актуалізацыя тэмы. (3 хвіліны).

**Метадыст 1.**

Фарміраванне іміджавай культуры свайго раёна – праблема актуальная і для сферы культуры ці не самая важная.

І тут лагічна паўстае пытанне: якія з'явы насамрэч складаюць змест нашай народнай культуры? Ці ёсць праблемы культурнага асяродка у нас і якія яны? Чаму наш раён не мае свайго брэнда? Чаму яго мінаюць турысты?..

Вось мы і паспрабуем паглядзець на сябе з іншага боку і адшукаць тое лепшае, што можна і самім паглядзець, і іншым паказаць, тое што сёння патрабуе зберажэння і развіцця, увасаблення ў новых формах і інш. Але перш чым звярнуцца да мэтанакіраванага пошуку і засваення інавацый у гэтай справе прыслухаемся да думкі дырэктара ДУК "ЦКС Краснапольскага раёна" Святланы Аляксандраўны Сазонавай, да яе бачання праблемы фарміравання станоўчага іміджу раёна і стварэння ўмоў актуалізацыі і развіцця традыцыйнай культуры Краснапольшчыны.

*(Выступленне дырэктара ДУК «ЦКС Краснапольскага раена» Сазонавай С. А. - прыкладнае):*

Грамадства на кожным з перыядаў свайго развіцця фарміруе сацыяльна-культурны заказ для сферы культуры. На сённяшні дзень актуальнай задачай з'яўляецца захаванне і развіццё нацыянальнай культуры, традыцыйных форм культурнай дзейнасці і адпачынку; стварэнне ўмоў для рэалізацыі інтэлектуальна-творчага патэнцыялу і павышэння духоўнасці чалавека.

У сучасным грамадстве культура, з'яўляючыся састаўной часткай сацыяльнай сферы грамадства, перастала быць замкнутай на сабе і разглядаецца як рэсурс і інструмент для дасягнення знешніх у адносінах да яе сацыяльна-эканамічных мэт, забяспечвае ўстойлівае развіццё сацыяльна-культурных складальнікаў якасці жыцця насельніцтва.

Гэта патрабуе ад нас, кіраўніцтва і спецыялістаў клубных устаноў, выкарыстання сучасных форм і метадаў творчай дзейнасці, атрымання ведаў, уменняў і навыкаў у адпаведных напрамках культурнай дзейнасці.

У наш час узнікае патрэбнасць стварэння станоўчага іміджу кожнага рэгіёна і брэндаў – асаблівых, унікальных праяў традыцыйнай культуры пэўнай мясцовасці. Гэта справа, шчыра кажучы, не надта і лёгкая. Мала ведаць ды шанаваць нейкую мясцовую традыцыю – трэба прафесійна яе ўвасабляць ды папулярызаваць на ўвесь свет. Але ж пачынаць з чагосці трэба!

У народнай культуры Беларусі і нашай Краснапольшчыны можна адшукваць брэнды, якія былі, ёсць і будуць! У кожнага рэгіёна нашай краіны – свае культурныя асаблівасці, свае песні і танцы, рамёствы і строі адзення, свае арнаменты, свае абрады і фестывалі.

Хочацца знайсці ўсё лепшае і непаўторнае на сваёй малой радзіме. Знойдзем, убачым яго ўнікальнасць самі – убачыць ўвесь свет.

Творчай вам працы, добрых вынікаў і задавальнення ад сустрэчы з творчымі праявамі культурнага жыцця Краснапольшчыны.

**"Спяваем песні мы з сялянскіх хат".** (15 хвілін).

З вопыту правядзення фальклорных экспедыцый (інтэрв'ю) і майстар-клас па актуалізацыі аўтэнтычнай песні народным фальклорным ансамблем "Горскія харашухі" (мастацкі кіраўнік В. А. Марчанка); выстаўка метадычнай прадукцыі калектыву.

**Метадыст 1.**

Паэт Ніл Гілевіч казаў: "Калі табе, спявак, патрэбны ўрокі, дык вось адзін: старайся гэтак пець, каб дом свой родны песнямі сагрэць, тады пачуе іх і свет шырокі".

Дырэктар абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Хмялькоў А. Ф. заўважыў, што акрамя вялікіх імпрэз на ўзроўні вобласці ці рэспублікі хацелася б бачыць сапраўднае культурнае жыццё на месцах і беражлівыя адносіны да кожнай праявы традыцыйнай народнай спадчыны.

Традыцыйная культура вёскі, "песні з сялянскіх хат" могуць зыйсці ў небыццё – жывыя іх носьбіты разам з вёскамі знікаюць. Гэта з'ява востра ставіць пытанне захавання традыцыйнай народнай культуры ўсімі магчымымі спосабамі.

**Метадыст 2.**

Апошнім часам у нашым раёне актывізавалася работа па збіранню і папулярызацыі фальклорнай спадчыны.

У многім гэтаму паспрыялі такія значныя культурныя падзеі, як уключэнне ў раённы доўгатэрміновы праект "Забытае ўваскрашаецца", раённы фальклорны конкурс "Чары сівой даўніны", арганізацыя работы творчай групы з ліку спецыялістаў СДК пад кіраўніцтвам метадычнага аддзела, наяўнасць стабільных фальклорных калектываў, павелічэнне колькасці фальклорных экспедыцый і станоўчы вопыт работы ў гэтым напрамку, які абагульнены і вывучаецца. Носьбітам такога вопыту з'яўляецца народны фальклорны ансамбль "Горскія харашухі" з в. Горы. Ён – удзельнік нашай гасцёўні.

**Кампазіцыя "Зямля, якая спявае"**

*(Каля вогнішча сядзяць і спяваюць жанчыны, іх слухаюць дзеці, моладзь).*

**Расказчыца:** Вечарэе... Дзень даўно павесіў на сасне сваю касу зары, час і нам дамоў...

**Дзеці:** ...Паданне просім. Цётачка, яшчэ пагавары.

**Расказчыца:** Паведаю яшчэ адно. Слухайце...

Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы, ды яшчэ паўдня. Стаміліся, прыселі. Чуюць раптам – спявае нехта...

*(Жанчыны напяваюць народную песню "Закаці, ты, яснае сонейка")*

**Расказчыца** *(працягвае)*:

Відаць, жаўранак, - кажа першы.



Не, - кажа другі. - Гэта лес шуміць, чуеце?!

*(Жанчыны напяваюць народную песню "Вецер вее").*

А трэці падарожнік прыпаў вухам да зямлі, паслухаў...

*(Жанчыны напяваюць народную песню "Туман ярам").*

Паслухаў трэці падарожнік і кажа: "Дык гэта ж наша зямля спявае!"

Вы пазналі гэту зямлю? Гэта наша зямля!

Вы пазналі гэтыя песні? Гэта нашы песні!

"Пад песні кладуць чалавека ў калыску і са спевамі ж апускаюць у магілу яго. Штодзённымі клопатамі поўніцца людское жыццё. Але калі зварухнецца душа чалавека, толькі песня здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае".

Так вучыў Хрыстос. Але Пётр, пачуўшы яго словы сказаў: "Вучыцелю, у гэтай староньцы ёсць людзі, каторым няма чаго есці. Ці ж не сціснецца ад сораму сэрца гэтага чалавека, каторы, шукаючы скарынку хлеба, прыйдзе з песняй да іх?"

І, адказваючы яму, сказаў Хрыстос: "Так, жыццё гэтых людзей цяжкае, беднае і прыгнечанае. Чаму ж ты хочаш яшчэ пазбавіць іх красы?"

І, звярнуўшыся да музыкі, спытаў: "Калі пяюць песні ў вас?"

Музыка адказаў: "Пяюць на Каляды, на Запусты, на Вялікдзень, на Троіцу, на Яна Купалу, у пятроўку, на зажынках і дажынках.

Пяюць на радзінах і хрэсьбінах, пяюць, дзіцё калыхаючы, і самі дзеці пяюць, гуляючы; пяюць на ігрышчах і вечарынках, і на вяселлях, і на хаўтурах, і ў бяседзе, і ў працы, і на вайну ідучы, і ва ўсякай іншай прыгодзе. Увесь круглы год пяюць".

І прамовіў Хрыстос Пятру: "Ты, шкадуючы долі галодных людзей, асудзіў песню, але самі галодныя не асудзілі яе. Жывая яшчэ душа ў народзе гэтым".

І босыя ногі Хрыста пакідалі на цёплым і мяккім пыле дарогі сляды. Не затаптаць бы іх... *(Гучыць аутэнтычная песня "Ой, паходжана").*

**Метадыст 2.**

На сённяшні час, калі традыцыйная культура адыходзіць з жывога бытавання, калі яе носьбітаў становіцца ўсё менш, збіранне, пераймане яшчэ жывых форм гэтай культуры, яшчэ не зышоўшых у нябыт фальклорных тэкстаў становіцца асабліва актуальнай.

Нашы пытанні да мастацкага кіраўніка народнага фальклорнага ансамбля "Горскія харашухі".

- Колькі культурна-песенных адзінак фальклорнай спадчыны сабрана вашым калектывам за 25 гадоў яго існавання і наколькі яны ўнікальныя на вашу думку?

- На сённяшні час у нашым рэпертуарным зборніку каля сотні песень і больш таго. І гэта песні амаль толькі в. Горы. Так што "поле" збіральнай дзейнасці можна пашыраць да памераў усяго раёна. Кожны з сабраных твораў лічу ўнікальным, многія з іх мы не сустракалі не толькі ў розных кутках Беларусі, а і Краснапольшчыны. Калі ж характарызаваць іх па жанрах, то гэта песні: каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, пазаабрадавыя. Вясельных песень перанята больш за двух дзесяткаў, ёсць песні восеньскія, жніўныя, вясеннія, летнія. З ліку пазаабрадавых шмат песень пра каханне.

Адна з асаблівасцей песень нашых вёсак у тым, што яны працяглыя, доўгія, сярод іх многа пакутлівых, сумных – у іх часта паўтараюцца словы "ой", "о-хо-хо". Безумоўна, гэта адгалоскі быцця і гісторыі нашага краю, які ў свой час лічыўся "літоўскай пустэчай".

Тых каго цікавіць наша песенная культура інфармую, што існуюць аформленыя альбомы і брашуры нашых збораў "Песні з

сялянскіх хат". Звярніце ўвагу на нашу выставу. Ёсць аўдыа- і відэа- запісы. І, канешне, можна слухаць жывое гучанне калектыва і яго салістаў. Хто ж цікавіцца вопытам правядзення фальклорных экспедыцый і практыкай збірання, актуалізацыі фальклору, адсылаю тых да абагульненага вопыту нашай работы (выдадзены альбом) і, канешне, заўсёды будзем рады новым сустрэчам.

Можам прадставіць фрагменты абрадаў: вяселля, зажынак, дажынак, Юр'я; пакроўскія вячоркі; прэзентацыю вясельных песень, гасцёўню "Лірыка кахання" і інш. Можам даць ансамблевыя і сольныя канцэрты. Хацелася б прадставіць песенную спадчыну Краснапольшчыны для надання ёй статусу нематэрыяльнай культурна-гістарычнай каштоўнасці Беларусі.

Дзякуй за размову. Поспехаў вам!

**Метадыст 2.**

Аўтэнтычныя песні нашай Краснапольшчыны ў выкананні "Горскіх харашух" гучалі ва многіх гарадах Беларусі - ад Краснаполля да Мінска, іх з цікаўнасцю слухаюць у Расіі.

Гэтыя песні – сапраўдны брэнд Краснапольшчыны, яе "жамчужыны".

**Рэфлексійны момант "Тэлеграма".**

Калегі, калі б вам прапанавалі адправіць тэлеграму "Горскім харашухам", якія б словы вы адрасавалі ім?! Прашу выказацца.

**"Народны касцюм – адно з найвышэйшых дасягненняў народнай культуры".** (5 хвілін).

- Азнаямленне з асаблівасцямі Краснапольскага строю адзення;
- Прэзентацыя вынікаў творча-пошукавай, праектнай дзейнасці.

**Метадыст 2.**

Яркім здабыткам традыцыйнай культуры і важным сімвалам кожнага народа з'яўляецца народнае адзенне. Пра асаблівасці Краснапольскага строю мы зараз даведаемся. Гэта вынік пошукава-творчай дзейнасці нашай творчай групы. Матэрыялы даследавання прадстаўлены ў форме рэферата, відэафільма.



Мы прапануем вось такую прэзентацыю. Слухайце і глядзіце.

*(Прэзентацыя касцюма Красна-польскага строю.)*

**"Сляды мінуўшчыны".** (7 хвілін).

- сустрэча з носьбітамі малых форм фальклору: загадкі, жарты (Юркіна Аляксандра Піліпаўна, Сідараўскі СДК);
- сустрэча з майстрам ігры на "перакуленым" гармоніку (Занудзенка М. А., Ленінскі СДК).

Актуалізацыя фальклорнай спадчыны.

**Метадыст 1.**

Вас прыцягваюць незвычайныя праявы культурнага жыцця? Тады знаёмцеся! Знаёмцеся з майстрам ігры на гармоніку! Ён з вёскі Леніна нашага раёна. Гэта Занудзенка Мікалай! *(Майстар грае на гармоніку).*

Калі нехта з вас паспеў падумаць: "Ну што тут дзіўнага!", папрашу не спяшыць, а ўважліва паглядзець і паслухаць далей!

*(Майстар пераварочвае гармонік і працягвае іграць).*

Вы бачыце, што адбываецца?! Майстар-гарманіст выдатна валодае сваім інструментам, нават калі той "перакуліўся з ног на галаву".

Сябры! Гэтага майстра ігры на "перакуленым" гармоніку я адкрыла для сябе ў гэтым годзе выпадкова, як гэта часта адбываецца ў час правядзення фальклорных экспедыцый. Так ён іграе ўжо тры дзясяткі гадоў.

Дзе выкарыстана гэта асаблівасць і з'ява? Анідзе! Хто ведае пра яе акрамя само-

га гарманіста ды вясковых спявачак, якім ён "падыгрывае"? А з'ява, згадзіцеся, цікавая! Прызнаюся, мы пачалі ёй займацца, у бліжэйшай перспектыве бачым удзел Міколы ў фестывалі гумару ў Аўцюках – ідэі ў нас ёсць, а пакуль папулярызуем праз СМІ, зрабілі фотасесію, буклеты.

І яшчэ, аб чым мне хацелася б распавесці, – аб найцікавейшых фактах, якія літаральна "высыпаліся" з культурна-гістарычнага вясковага жыцця мінулых гадоў, як прыгожыя пацеркі, калі мой суразмоўца Мікола Занудзенка распавёў пра вёску свайго дзяцінства, яе жыхароў і майстроў!

Гармонік у Міколы таксама ўнікальны! Ён быў зроблены вясковым майстрам Ларькоўскім Уладзімірам Васільевічам, які жыў у в. Забор'е. З гэтым інстументам і не растаецца Мікола Занудзенка ўжо 35 гадоў! Беражэ яго, як зрэнку вока.

Навучыўся іграць "на слых" ад бацькі і сваякоў, бо ўсе яны валодалі музычнымі інструментамі: дзед іграў на скрыпцы і гармоніку, дзядзькі – хто на гармоніку, хто на балалайцы. Сам жа дзядзька і вырабляў балалайкі! Ці даўно быў той час – і дзе яно?!...

Дзеля чаго ўключыла я гэты фрагмент у сённяшнюю гасцёўню?

З-за ўнікальнасці, па-першае. А яшчэ, каб сказаць: не шкадуйце сваіх высілкаў на пошук! На пошук праяў культурнага жыцця, нават калі яны здаюцца на першы погляд нязначнымі: як тая гульня ў каменчыкі, што адшукалі ў Дрыбіне, як слова "кабачкі" ці "кабелькі", якое павёз з Краснапольшчыны Янка Крук, як гэты "перакулены гармонік"! Не шкадуйце сіл і на актуалізацыю! Знаходзьце розныя формы і моманты, каб даць гэтым праявам жыццё, данесці іх да людзей, зрабіць культурнымі з'явамі.

На правах гаспадыні гасцёўні я спецыяльна не дала сказаць і слова Міколу: калі з'ява вас зацікавіла, адрас майстра вы ведаеце!

А вось сыграць дазволю, бо, як кажуць, хоць трэсні, а гарманісту дай паіграць песню! *(Гучыць гармонік.)*

Мы ўзраслі на тваім сырадоі,
Краснапольшчына, маці-зямля.
Хай спявае твой звонкі гармонік,
Краснапольшчына, песня мая!

**Метадыст 2.**



У беларускім фальклоры надзвычай многа і малых яго форм: гэта прыказкі і прымаўкі, жарты ды загадкі. Ёсць і майстры іх ужываць!

Знаёмцеся – Юркіна Аляксандра Піліпаўна, старэйшая ўдзельніца фальклорнага гурта Сідараўскага СДК. Ёй 88 гадоў, а памяць яе захоўвае цэлы россып жамчужын народнай мудрасці!

- Піліпаўна, вы прызнаваліся, што падтрымлівае вас у жыцці добры настрой ды любоў да жартаў. Можа, пацешыце і нас якім жартам?

- А яшчэ вы любіце збянтэжыць людзей сваімі загадкамі! Можа "паламаеце" галовы нашым гасцям?

**Метадыст 1.**

Сябры, пакуль вы "ламаеце" галовы над загадкамі, а адгадаўшых чакае прыз(!), мы запрашаем вас ...пагушкацца – так заўсёды рабілі на Сараĸі, якія толькі што прайшлі. Толькі замест арэляў мы прапануем каруселі. Час адпачыць, сябры, ўставайце! *(Праводзіцца фізкультхвілінка "Каруселі").* (2 хвіліны). *(Уручаюцца прызы адгадаушым загадкі).*

**"Традыцый родных не забыць – яны ад прадзедаў і дзедаў".**

- Выстаўка вырабаў Дома рамёстваў; шляхі і магчымасці папулярызацыі і развіцця народных рамёстваў.
- Сустрэча-інтэрв'ю з дырэктарам установы Маскальковай В. В. (10 хвілін).

**Метадыст 2.**

Прапануем памяняць месца нашай працы і прайсці да выставы Дома рамёстваў.

У нашым краснапольскім краі жылі і

жывуць вельмі таленавітыя і працавітыя людзі. Прыемна і радасна тое, што многія традыцыі нашых продкаў захоўваюцца, і мы маем цудоўную магчымасць пабачыць на свае вочы прыгажосць працы, душы і рук чалавечых. Прадстаўляю майстроў раённага Дома рамёстваў. *(Прадстаўляюцца майстры).*

Мы бачым, што праца йдзе з аглядкай на мінулае.

Нашы пытанні да дырэктара РДР:

- Некалькі слоў аб папулярызацыі сваіх вырабаў. Дзе былі? У якім свеце?

- Ці выклікаюць цікаўнасць творы краснапольскіх майстроў?

- Што з вашых вырабаў можна лічыць візітоўкай Краснапольшчыны?

- Лялькі вы "апранулі" у мясцовы строй. Ці мяркуеце зрабіць тое ж і лялькамі-абярэгамі? Здаецца яны хутчэй знойдуць распаўсюджванне і змогуць заявіць пра сябе не толькі ўнікальнасцю, а яшчэ і з-за меншага кошту?

- На Краснапольшчыне існавала традыцыя вышывання надпісаў на канцах ручніка. Ці плануеце ўвасабленне на ручніках (а ў вас ёсць майстар-вышывальшчыца) надпісаў, напрыклад "Краснаполле". Чым не візітоўка раёна?

- Будзем рады бачыць пачутае! І яшчэ адно пытанне: ці многа ў вас тых, хто імкнецца пераняць майстэрства, людзей, неабыякавых да мінуўшчыны?

- З якімі катэгорыямі вы маеце зносіны і якія формы прапануеце?

**Дырэктар Дома рамёстваў**

- Дом рамёстваў гатовы працаваць і працуе з рознымі катэгорыямі людзей і прапануе розныя формы работы, сярод якіх:

- выстаўкі майстроў (персанальныя, тэматычныя, у рамках культурных мерапрыемстваў);

- клубныя фарміраванні;

- арганізацыйна-метадычная работа для майстроў, для спецыялістаў СДК (майстар-класы, кансультацыі, круглыя сталы);

- пазнавальныя праграмы па папулярызацыі рамёстваў для дзяцей, дарослых: майстар-класы, круглыя сталы, гутаркі, паказы,



кансультацыі;

- Экспедыцыйная і даследчая работа.

Пажадаем поспехаў вам, майстры, а спецыялістам клубных устаноў – жадання і гатоўнасці да выкарыстання такога добрага патэнцыялу ў арганізацыі гурткоў адпаведнага накірунку (такіх на вёсцы пакуль няма) і развіцці ўласнага ўмельства.

**"Родная хата працай багата".** (15 хвілін). Майстар-клас па правядзенні інтэрактыўнага занятку ў этнаграфічным кутку. Метадыст В. Марчанка.



**Метадыст 2.**

Асаблівую ролю ў выхаванні грамадзянскасці і патрыятызму, у фарміраванні

цікаўнасці да традыцыйнай культуры народа іграюць этнаграфічныя экспазіцыі і куткі ўстаноў культуры. Іх экспанаты, увабраўшы імгненні мінулага, робяць іх дарункам сёняшняга часу і фарміруюць адносіны да гісторыі і культуры сваёй зямлі.

Як зацікавіць падрастаючае пакаленне гэтай спадчынай? Як прывабіць іх у музеі і куткі этнаграфіі?

"Шукаць новыя формы і прыёмы, новыя тэхналогіі", - лічыць метадыст Цэнтра культуры Валянціна Марчанка і запрашае вас, калегі, у куток этнаграфіі.

Глядзіце, слухайце і вучыцеся, бо ёсць чаму!

*(Праводзіцца майстар-клас па выкарыстанні інтэрактыўнай формы занятку у этнаграфі чным кутку.)*
